па галаве, гледзячы ў вочы. Пасля сам лізнуў яго, Джукі, у нос і заплакаў» [4]. Калі аўтобус пачаў свой рух, Джукі бег за ім аж да Стралічава, не дабегшы да Хойнік.

У творы выразна паказана, як паступова памірае жыццё ў вёсцы пасля таго, як людзі пакінулі яе, да таго ж ніякіх рэчаў яны з сабой узяць не маглі, як і забраць сваіх жывёл. Па сутнасці, яны вымушаны былі пакінуць іх паміраць з голаду ў адзіноце, бо ніхто болей не прыйдзе іх даглядаць.

А колькі трагічных гісторый, падобных да тых, што прадстаўлены ў прааналізаваных вышэй творах Ю. Станкевіча і І. Пташнікава, было па ўсёй Беларусі? Колькі зламаных жыццяў? Колькі нешчаслівых людзей? Або занадта рана памерлых? Колькі пакінутых у адзіноце? Менавіта на гэтым акцэнтуюць увагу ў сваіх творах аўтары, заклікаючы чытачоў не забываць пра Чарнобыльскую трагедыю, якая для беларусаў стала агульнанацыянальнай.

**Літаратура**


1 Афанасьеў, І. М. Чарнобыльскае светаадчуванне ў сучаснай беларускай літаратуры. Вып. 1: Бягучы літ. працэс у крыт. аглядзе. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 206 с.

2 Станкевіч, Ю. Паўночны вецер для спелых пладоў : раман, аповесці, апавяданні / Юры Станкевіч. – Мінск : Галіяфы, 2015. – 354 с.

3 Станкевіч, Ю. Любіць ноч – права пацукоў [Электронны рэсурс] / Юры Станкевіч // Беларуская палічка. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Jury_Stankievic/Lubic_noc -prava_pacukou.html. – Дата доступу : 13.04.2021.

4 Пташнікаў, І. Львы [Электронны рэсурс] / Іван Пташнікаў // Беларуская палічка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Ivan_Ptasnikau/Lvy.html. – Дата доступу : 21.04.2021.



**УДК 821.161.3-14*У. Дубоўка**



***Г. У. Таргонская***


## ПРАЦЭСЫ ПЕРЦЭПТУАЛІЗАЦЫІ Ў ЛІРЫЦЫ У. ДУБОЎКІ І ІХ МАСТАЦКАЯ ФУНКЦЫЯ


*У артыкуле на прыкладзе лірыкі У. Дубоўкі разглядаюцца адметнасці паэтычнага ўвасаблення працэсаў перцэптуалізацыі. У сваіх вершах паэт карыстаецца зрокавым, слыхавым і дотыкавым модусамі перцэпцыі, якія на падсвядомым узроўні ўздзейнічаюць на чытача, які пачынае суперажываць лірычнаму герою. Сфера пачуццяў у вершах раскрываецца з дапамогай каларыстыкі: кожнае адценне мае сваю сімволіку і асацыятыўнасць, слыхавы модус надае вобразам кінематаграфічнасць.*


Мастацкі твор уяўляе сабой індывідуальную інтэрпрэтацыю рэчаіснасці аўтарам як вынік пазнання. Крыніцай любога кагнітыўнага працэсу прынята лічыць эмацыйна-пачуццёвыя адчуванні і ўражанні, якія пасля падлягаюць моўнай апрацоўцы ў адпаведнасці з канцэптуальнымі ўстаноўкамі свядомасці аўтара. Галоўным «інструментам» адлюстравання мадэлі вобраза свету ў творы выступае працэс перцэптуалізацыі, выяўлены праз зрок, слых, дотык, нюх (модусы перцэпцыі).

Уладзімір Дубоўка з'яўляецца адным з нешматлікіх беларускіх пісьменнікаў-эстэтаў савецкага часу, якім удалося раскрыць сферу пачуццяў і рэфлексіі ў літаратурным тэксце. Ён стварае ў сваіх вершах вобразы прыроды такім чынам, каб чытач уявіў сабе карціну свету праз прызму ўспрыняцця навакольнага асяроддзя аўтарам.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«Мастацкі вобраз выступае не проста як знешняе падабенства з рэчаіснасцю, а праяўляецца ў выглядзе творчых адносін да гэтай рэчаіснасці як спосаб дамысліць, дапоўніць рэальнае жыццё. Мастацкі вобраз – гэта сутнасць мастацтва, гэта пачуццёвае аднаўленне жыцця, зробленае з суб'ектыўных аўтарскіх пазіцый. Мастацкі вобраз канцэнтруе ў самім сабе духоўную энергію, якая стварыла чалавека, выяўляючы сябе ў кампазіцыі, колеры, гуку ці іншым зрокавым выяўленні» [1, с. 71], – адзначае І. Пархоменка. Адзін з асноўных вытокаў вобразаў у паэзіі – зрокавае ўспрыманне. Па вялікім рахунку ўсё, што звязана з апісаннем навакольнай рэчаіснасці ў тэксце, звязана з візуалізацыяй. Так, У. Дубоўка менавіта праз зрокавы модус перцэпцыі часцей за ўсё адлюстроўвае, як навакольны свет уплывае на маральны стан і настрой лірычнага героя:

Журавінамі плача восень,
Аправіўся тугою абшар.
Я не ведаю, можа, здалося, –
Незвычайна баліць душа.
Аправіўся тугою абшар,
А верасень сэрца калечыць.
Незвычайна баліць душа,
Быццам ціснe нешта на плечы [2, с. 32].
(«Трыпціх»)

Стан прыроды ў гэтым вершы зліваецца з псіхалагічным настроем лірычнага суб'екта ў адзінае цэлае, утвараючы так званы «пейзаж душы». Герой тонка адчувае прыроду, якая, у сваю чаргу, адчувае яго стан. Паўтор радкоў «аправіўся тугою абшар» мае на мэце ўзмацніць эмацыйны эфект, падкрэслівае тугу і ўзрушанасць лірычнага героя, сэрца якога калечыць верасень. Зрокавыя вобразы адгукаюцца наступнымі арыгінальнымі асацыяцыямі: «А верасень сэрца калечыць // Пальцамі жоўтых кляновых лістоў. // Быццам ціснe нешта на плечы, // Галаву схіляе на дол» [2, с. 32] («Трыпціх»).

Трэба адзначыць, што ва ўвасабленні пейзажу аўтар надае падкрэсленую ўвагу фарбам. Жоўты колер часта асацыюецца ў яго з восенню, аднак гэтае «золата» ўводзіць лірычнага героя ў лёгкую меланхолію, навявае роздумны, элегічны настрой. Журавіны таксама адзін з класічных атрыбутаў восені, якi суадносіцца з чырвонымі адценнямі. Такая колеравая гама спрыяе ўзнікненню восеньскай карціны ва ўяўленні чытача, задае адпаведны настрой. У вершы «Пальцы жоўтых кляновых лістоў…» жоўты колер, наадварот, стварае пазітыўны настрой. Кожны радок прасякнуты рамантыкай і захапленнем хараством такой пары года.

Сімволіка колеру ў творах У. Дубоўкі прызначана не толькі ўзмацніць пластычнасць вобразаў, але і ўздзейнічаць на пачуцці чытача, задаваць пэўны эмацыйны настрой: «Пачынаецца з-пад хмар вандроўных, // Пачынаецца з лясоў шумлівых. // Захадзіла сонца ціха-роўна, // А на захадзе чырвань нехта выліў» [2, с. 35] («Пачынаецца з-пад хмар вандроўных…»). Фраза «чырвань нехта выліў» не проста ўвасабленне, тут у трох словах праступае складаная асацыятыўная паралель прыроды з мастаком-жывапісцам, для якога неба з'яўляецца мальбертам:

І змоўклі дразды над балотам,
І у лесе сівакракі замоўклі.
Ноч пацягнула бяліць палотны,
Развіваючы непразрыстыя столкі [2, с. 35].
(«Пачынаецца з-пад хмар вандроўных…»)

Дзеяслоў «бяліць» непарыўна звязаны з белым колерам, семантыка якога ідэнтычная сонечнаму святлу, г. зн. не нясе негатыўнага сэнсу. У радках верша гэты дзеяслоў дапамагае стварыць нейтральную атмасферу праз карціну прыроды. Гэта не адзінае яго значэнне ў творчасці паэта, але ў кантэксце ўказанага верша яно больш дарэчнае.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Цікава адзначыць, што У. Дубоўка быў прадаўжальнікам эстэцкіх ідэй М. Багдановіча, таму прысвяціў яму верш, дзе ў адпаведнай колеравай гаме, якая стварае настрой смутку, выкарыстоўвае пейзаж: «Нават мора змяніла колер: // Стала не сінім, а шэрым. // Пырскі салёныя вусны коляць; // Камяніцца ў істоце шэрань» [2, с. 37] («Нават мора змяніла колер…»). Сімволіка шэрага колеру ў псіхалогіі звязана з адрачэннем, пакорай, меланхоліяй. Але ў кантэксце іншых вобразаў верша гэты колер азначае адно – смерць. Тут мы маем чарговы імпрэсіяністычны «пейзаж душы». Мора змяніла колер, «памерла», менавіта так лірычны герой і ўяўляе сваю недалёкую будучыню. Навокал толькі шэрасць: усё нежывое, пазбаўленае колераў, мёртвае. У вершы «Палыны пасівелі на ўзгорку…» шэры колер набывае іншае значэнне: пасівеласць тут яўны знак горычы, павольнага згасання.

У. Дубоўка нярэдка выкарыстоўвае і зялёны колер, які нясе ў яго мастацкай сістэме пазітыўнае значэнне. Гэта колер расліннасці (мабыць, таму аўтар і суадносіць яго з з кіпарысамі). Адсюль усе яго станоўчыя значэнні: рост, вясновае адраджэнне прыроды, надзеі (на ураджай), маладосць. У рэлігійнай традыцыі гэта колер Эдэмскага саду, аазісу ў пустэльні і мусульмансакага раю. Святы сцяг Магамета і ўсяго мусульманскага свету – зялёны, што знаходзіць адлюстраванне ў сучаснай сімвалічнай і геральдычнай сімволіцы ўсходніх краін. Такія значэнні колеру наводзяць на думку, што лірычны герой жадае гармоніі і раю М. Багдановічу на тым свеце. Разам з тым зялёны колер у вершы У. Дубоўкі можна трактаваць нетрадыцыйна, як знак (калі не сімвал) запакоенасці:

Навакола – карункі з камення
Падарунакам апошнім завіліся.
Свечы зялёныя высока праменяць;
Людзі кажуць, гэта кіпарысы… [2, с. 37]
(«Нават мора змяніла колер…»)

Рыжы колер дазваляе паэту стварыць вобраз бунтара, раскрыць тэму супрацiўлення. Сама па сабе сімволіка гэтага колеру ў вершы непрыемная і асацыюецца з разбурэннем, занядбаннем, іржой: «Ты не ляжаш на магілкі крыжам, // А ў труну ўгрызешся цвікамі. // І тады ў пырніку рыжым // Над табою паўстане камень» [2, с. 37] («Нават мора змяніла колер…»). Аўтар мае на ўвазе жалобу, якой не суджана знайсці эмацыйнага выйсця, нягледзячы на адчайны яго пошук і спробы «ў труну ўгрызціся цвікамі».

У сваім знакавым, хрэстаматыйным вершы паэт апісвае Беларусь пры дапамозе зялёнага і чырвонага колераў, якія трывала замацаваліся за нашай краінай і з'яўляюцца атрыбутам сённяшняй дзяржаўнай сімволікі:

О Беларусь, мая шыпшына
Зялёны ліст, чырвоны цвет!
У ветры дзікім не загінеш,
Чырнобылем не зарасцеш [2, с. 113].
(«О Беларусь, мая шыпшына…»)

Зялёны – гэта колер густых лясоў і ўрадлівых палёў нашай краіны, апрацаваных рукамі земляробаў. Колер дабра, развіцця, росквіту і міру. Чырвоны – сімвал крэўных повязяў і братэрства.

Трэба адзначыць, што акрамя зрокавых вобразаў У. Дубоўка выкарыстоўвае і слыхавыя, якія аказваюць не горшы эфект у стварэнні паэтам запамінальных мастацкіх вобразаў. Модус перцэпцыі «слых» – таксама адзін з галоўных каналаў паступлення інфармацыі пра свет. Гэта працэс, які працякае ад псіхафізіялагічнага перцэптыўнага ўспрымання да складанай ментальнай дзейнасці, што адлюстроўвае ўспрыманне рэчаіснасці. У лірыцы У. Дубоўкі слыхавыя вобразы сведчаць пра тонкае адчуванне навакольнага свету лірычным суб'ектам. Рэчы набываюць уласцівасці жывых істот, герой чуе ўсе гукі гэтага гарманічнага суладдзя:

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Там, на Беларусі, дзе пачуў жыццё,
Чуў я, колькі чуў я! як шуміць трысцё.
Бы цымбалаў струны, шчыльныя рады
Шапацелі звонам ля ракі тады [2, с. 43].
(«Дзяўчына»)

Лірычны персанаж У. Дубоўкі адчувае сябе часткай прыроды, зліваецца з ёю. Ён здольны бачыць, як «дрыжаць зоркі», чуць, як «вецер калыша палын» і «галосіць мяжа»; заўважае кожную дэталь, кожны нюанс. І праз гэтыя назіранні і гукі герой адчувае прыроду, спазнае яе, бачыць нешта большае, чым можна заўважыць у паўсядзённым колазвароце з'яў: «Калыша вецер палын на ўзгорку, // Скаргамі галосіць мяжа. // І, спагадаючы пакрыўджаным, зоркі // Мацней над светам дрыжаць» [2, с. 43] («Дзяўчына»). У прыведзеных радках чуецца і адчуваецца прырода, яе дынаміка. Цікава, што слыхавыя эфекты дазваляюць візуалізаваць малюнак навакольнай рэчаіснасці праз гэтыя «мелодыі» ў дэталях, блізкія да жалобных песень, галашэнняў:

Гудзяць лясы, гудзяць лясы над гарою,
Прападаю маладая ў непакою, ў непакою.
Шуміць вада, шуміць вадапад лядамі,
Што ж мне цыці занядбанай, занядбанай? [2, с. 44]
(«Дзяўчына»)

Дынаміка рэзкіх гукаў стварае ў вершы настрой непакою, трывогі. Лірычная гераіня не можа знайсці сабе месца, як і тыя прыродныя з'явы, што парушаюць маўчанне. Гукі «малююць» карціну непагадзі, дакладней – пераходнага стану. Чытач прадчувае, быццам зараз пойдзе дождж ці нават лівень, сімвалізуючы знаходжанне гераіні ў памежнай сітуацыі, на мяжы жыцця і смерці.

Даволі важнае месца ў лірыцы У. Дубоўкі займаюць дотыкавыя вобразы. Так, амаль на фізічным узроўні чытач адчувае, як балота топіць сваёю «рукой» чалавека: «То не сонца хмары пакрышыла // І праменні прыгоршчамі разліло, – // Большага брата прыгарнула па шыю // І за шыю сціскае балота далонь» [2, с. 51] («Бра…Гінь…»).

Цікавы дотыкавы вобраз звязаны ў паэта з сэрцам, якое сціскаецца да болю, ледзь не рвецца. Лірычны герой не задаволены будаваннем палацаў панам. Ён параўноўвае свае перажыванні з мінулым жыццёвым вопытам, дзе нават журба не выклікала ў яго столькі болю:

Узнасілі на вышкі каменне,
Будавалі панам палацы.
Так журба не сціскала жменяй
Сэрца, што маніцца парвацца [2, с. 65].
(«Грахі чубатыя»)

Такім чынам, зварот да працэсаў перцэптуалізацыі дапамагае У. Дубоўку стварыць яскравыя і запамінальныя вобразы ў лірыцы, найперш пейзажнай. У сваіх вершах паэт карыстаецца зрокавым, слыхавым і дотыкавым модусамі перцэпцыі, якія дапамагаюць чалавеку больш поўна ўяўляць навакольны свет і на падсвядомым узроўні ўздзейнічаюць на чытача, які пачынае суперажываць лірычнаму герою. Паэзія У. Дубоўкі найперш зрокавая. Слыхавыя эфекты, як ні дзіўна, узмацняюць пластычнасць візуальнага вобраза, надаючы яму кінематаграфічнасць.

**Літаратура**

1 Пархоменко, И. Т. Культурология в вопросах и ответах для зачётов и экзаменов: учеб.пособие / И. Т. Пархоменко, А. А. Радугин. – Мінск : Центр, 2001. – 336 с.

2 Дубоўка, У. М. О Беларусь, мая шыпшына...: Выбранае / У. М. Дубоўка; уклад. Д. М. Давідоўскага, З. К. Пазняк. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 318 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ